***В. А. Касап,*** *канд. пед. навук, дац.,*
*заг. каф. тэорыі і гісторыі ІДК БДУКМ*

# ФАРМІРАВАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ГАЛІНОВЫХ БІБЛІЯТЭК У ДАПАМОГУ ПРАЦЭСУ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ

Інфармацыйныя рэсурсы – гэта неад’емная складаючая інфармацыйнай прасторы бібліятэкі, яе сутнасць, тое, без чаго немагчыма яе існаванне. У спецыяльных галіновых бібліятэках (рэспубліканскія галіновыя, галіновыя бібліятэкі устаноў вышэйшай адукацыі) інфармацыйныя рэсурсы ў дапамогу працэсу бесперапыннай адукацыі прадстаўлены бібліятэчнымі фондамі, у якія ўключаны дакументы на традыцыйных папяровых носьбітах, базы данных уласнай генерацыі, даведачна-пошукавы аппарат бібліятэкі; а таксама спасылкі на каштоўныя рэсурсы інтэрнэта, электронныя тэксты вучэбна-метадычнай літаратуры, знешнія базы даных, да якіх бібліятэка забяспечвае доступ.

Адзін з аспектаў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў спецыяльных бібліятэк заключаецца ў выбіральнасці камплектавання іх фондаў. Параўнанне палітыкі камплектавання фондаў бібліятэк тэхнічных, медыцынскіх, сельскагаспадарчых УВА і рэспубліканскіх галіновых бібліятэк у дапамогу працэсу бесперапыннай адукацыі паказвае, што розныя тыпы бібліятэк пры фарміраванні фондаў кіруюцца сваёй місіяй і задачамі, якія стаяць перад імі. Кожная бібліятэка рэалізуе сваё сацыяльнае прызначэнне шляхам выканання розных функцый. Для рэспубліканскіх галіновых бібліятэк уласцівы спецыяльныя функцыі інфармацыйнага забеспячэння навукова-вытворчай дзейнасці, інавацыйных праектаў, інфармацыйнага суправаджэння дзяржаўных, галіновых і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм, а таксама ў апошні час – інфармацыйнага забеспячэння адукацыйнага працэса. Бібліятэкі УВА маюць галоўную задачу – забеспячэнне навучальнага, выхаваўчага працэса, а таксама інфармацыйнае суправаджэнне навуковай дзейнасці выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў. Таму галоўнай сацыяльнай функцыяй будзе адукацыйная.

На працэс фарміравання фондаў у дапамогу адукацыйнаму працэсу аказваюць уплыў шэраг фактараў. Напрыклад, фарміраванне дакументнага фонду бібліятэкі УВА ажыццяўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пад уздзеяннем дзяржаўных адукацыйных стандартаў новага пакалення, змянення накірункаў падрыхтоўкі спецыялістаў; адкрыцця новых спецыяльнасцей, выкарыстання шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў; змянення нарматываў забяспечанасці вучэбнымі выданнямі. Крытэрыямі адбору дакументаў у фонд з'яўляецца тып выдання (вучэбныя, навуковыя, даведачныя, літаратурна-мастацкія выданні), адпаведнасць профілю ўстановы адукацыі, навукова-практычная значнасць дакументаў. Пры адборы таксама ўлічваюцца мова выдання, дата публікацыі, кнігазабеспячэнне пэўных дысцыплін. Павялічэнне кошту літаратуры, немагчымасць набыцця неабходных выданняў, якія выйшлі ў іншых краінах, абмежаваныя іх тыражы і выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій прывялі да неабходнасці стварэння электронных бібліятэк-рэпазіторыяў, якія ўключаюць электронныя паўнатэкставыя калекцыі вучэбнай літаратуры, падрыхтаванай выкладчыкамі і навуковыя выданні, прызначаныя для задавальнення патрэбнасцей у інфармацыі аб навучальнай установе і забеспячэння навучальнага працэса. Да такіх інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў забяспечваецца лакальны сеткавы доступ, а ў перспектыве – і on-line доступ. Развіццё данай тэхналогіі будзе паспяховым толькі пры вырашэнні пытанняў, звязаных з аховай аўтарскіх правоў. Аналізуючы склаўшуюся сітуацыю з фарміраваннем фондаў у дапамогу адукацыйнаму працэсу, спецыялісты разглядаюць тры варыянты папаўнення бібліятэкі электроннымі калекцыямі дакументаў: стварэнне ўласнай электронна-бібліятэчнай сістэмы; афармленне падпіскі на падрыхтаваную электронна-бібліятэчную сістэму ў знешніх арганізацый-агрэгатараў; стварэнне міжвузаўскіх электронных бібліятэк [4].

Асноўным вызначальным прынцыпам у дзейнасці рэспубліканскіх галіновых бібліятэк з'яўляецца іх накіраванасць на задавальненне спецыфічных інфармацыйных патрэбнасцей спецыялістаў навуковай і вытворчай, сфер дзейнасці. Для рэалізацыі гэтай мэты бібліятэкі фарміруюць галіновы па змесце фонд дакументаў, а таксама калекцыі асобных, унікальных відаў дакументаў (патэнтных, нарматыўна-тэхнічных, прамысловых каталогаў, неапублікаваных). Сёння кола карыстальнікаў гэтых бібліятэк не абмяжоўваецца толькі спецыялістамі, значную колькасць чытачоў складаюць студэнты, што адбіваецца на характары іх камплектавання. Адукацыйная функцыя рэспубліканскіх галіновых бібліятэк становіцца рэальнасцю і ў сувязі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хуткай мабільнасцю кадраў, пашырэннем іх функцыянальных абавязкаў, перакваліфікацыяй, што патрабуе ад бібліятэк стварэння адукацыйнага асяроддзя, фарміравання інфармацыйных рэсурсаў, якія дапамагаюць хуткай адаптацыі спецыялістаў, павышэнню іх кваліфікацыі і пашырэнню сферы прымянення ведаў. На дадзеным этапе развіцця рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі атрымоўваюць абавязковы экзэмпляр вучэбнай літаратуры айчынных аўтараў, а таксама (выбарча) замежных аўтараў. Пры набыцці вучэбнай літаратуры звяртаецца ўвага на *пашыраны чытацкі адрас выдання* (не толькі для выкарыстання студэнтамі, але для ажыццяўлення практычнай дзейнасці, каб выданні былі карысны для інжынераў, урачоў, аграномаў), на *вучэбныя выданні па новых для нашай эканомікі праблемах* (перавозка нафты, атамная энергетыка, трансплантацыя органаў чалавека, геннамадыфікаваныя прадукты харчавання), *на вучэбныя выданні, якія падрыхтаваны не толькі навучальнымі ўстановамі, але і навуковымі калектывамі*. Пры адборы дакументаў надаецца ўвага навуковаму статусу аўтара (наяўнасці навуковай ступені, навуковага звання). Пэўную колькасць вучэбных выданняў бібліятэкі атрымоўваюць праз дакументаабмен з бібліятэкамі краін СНД, у якасці ахвяраванняў ад міжнародных арганізацый і саміх аўтараў.

У цэлым у фондах рэспубліканскіх галіновых бібліятэк вучэбная літаратура складае да 50 % ад агульнага аб’ёму фонда. Крытэрыямі адбору вучэбных выданняў з’яўляюцца: актуальнасць і інфарматыўнасць зместу дакумента, тэматычная, галіновая прыналежнасць і месца выдання, мова выдання, аўтарскі прызнак, практыка-арыентаванасць вучэбнага зместу.

Значную дапамогу ў забеспячэнні адукацыйнай дзейнасці карыстальнікаў адыгрываюць БД рэспубліканскіх галіновых бібліятэк, якія змяшчаюць інфармацыю па розных аспектах галіновай навукі і вытворчасці. Напрыклад, РНТБ генерыруе звыш 30 БД, а забяспечвае доступ да звыш 100 БД. Яны змяшчаюць інфармацыю аб розных відах дакуменаў, забяспечваюць доступ да поўных тэкстаў вучэбнай літаратуры, манаграфій, патэнтных дакументаў. Напрыклад, БД «У дапамогу адукацыйнаму працэсу», падрыхтаваная бібліятэкай, змяшчае пералік нарматыўна-тэхнічных дакументаў, запатрабаваных УВА тэхнічнага профілю. Поўнатэкставая БД «БібліяРосіка», змяшчае 9 тыс. тэкстаў вучэбнай, навуковай литаратуры, а таксама артыкулаў з перыядычных выданняў па сацыяльна-гуманітар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных, эканамічных, прыродазнаўчых і тэхнічных дысцыплінах. РНМБ забяспечвае доступ да поўнатэкставай БД «i-books.ru», створанай вядучымі выдавецтвамі вучэбнай і навуковай літаратуры «Питер» і «БХВ-Петербург». Гэта электронная бібліятэчная сістэма распрацавана ў цесным кантакце з Асацыяцыяй бібліятэчных кансорцыумаў «АРБИКОН» і адлюстроўвае лепшыя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для вышэйшай школы.

У Расійскім сегменце інтэрнэта існуе шмат розных праектаў стварэння электронных вучэбных выданняў і размеркаванага рэсурса вучэбнай літаратуры: «Адзіная калекцыя лічбавых адукацыйных рэсурсаў», «Каталог адукацыйных рэсурсаў сеткі Інтэрнэт» і шмат іншых, дзе размяшчаюцца поўныя тэксты вучэбна-метадычнай, навуковай літаратуры. [1, 2, 3]. Напрыклад, электронная бібліятэка «КнигаФонд.ru» – гэта адзіная сістэматызаваная база вучэбна-метадычных матэрыялаў. Яна ўключае манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, тэксты лекцый, вучэбныя модулі, метадычны матэрыял, якія сістэматызаваны па галінах ведаў, дысцыплінах, спецыяльнасцях і інш. На сайце арганізацыі www.knigafund магчыма весці тэматычны пошук па ключавых тэрмінах, прадметных рубрыках, аўтары, загалоўку, спецыяльнасці, установе адукацыі. Зручны інтэрфэйс дазваляе складаць спісы літаратуры, рабіць уласныя кніжныя паліцы, весці свае электронныя канспекты з улікам аўтарскіх правоў. Праект электроннага кнігавыдання «КнигаФонд.ru» дае УВА магчымасць пашырэння ўласнай інфармацыйнай сістэмы, з’яўляецца карысным для дыстанцыйнай адукацыі і павышэння канкурэнтаздольнасці кожнай УВА. Стварэнне такіх інфармацыйных рэсурсаў грунтуецца на прынцыпе адкрытай ліцэнзіі, адкрытых архіваў і прызнана як найбольш перспектыўная мадэль распаўсюджвання навукова-адукацыйных рэсурсаў [1].

У сегменце беларускага інтэрнэта таксама прадстаўлены адукацыйныя парталы, сайты ўстаноў адукацыі (напрыклад, партал «Прафесійная адукацыя», сайт навуковай педагагічнай бібліятэкі і інш.), але яны ўтрымліваюць толькі спасылкі на іншыя рэсурсы, бібліятэкі, установы адукацыі, нарматыўна-прававыя акты. Размешчаныя поўнатэкставыя рэсурсы рэпазіторыяў бібліятэк маюць абмежаваны доступ.

Такім чынам, у адзінай адукацыйна-інфармацыйнай прасторы нашай краіны бібліятэкі галіновых устаноў адукацыі бачацца як асноўныя стваральнікі і захавальнікі электронных інфармацыйных рэсурсаў. Рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі бу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дуць ажыццяўляць навігацыю ў электронных адукацыйных рэсурсах, ажыццяўляць іх адбор, размяшчэнне і забеспячэнне да іх доступу шляхам прамога і ўскоснага ўзаемадзеяння на прынцыпах сацыяльнага партнёрства, калектыўнага доступу для бібліятэк-філіялаў і сеткавага прынцыпа арганізацыі такога ўзаемадзеяння.

1. *Антопольский, А.* Принципы формирования системы научной информации в Российской академии образования / А. Антопольский // Информационные ресурсы России. – 2009. – № 4. – Режим доступа: http: www/aselibrary.ru/ digital_resources/journal/irr. – Дата доступа: 17.11.2013.

2. *Козловская, М.* Книжные полки on-line / М. Козловская // Информационные ресурсы России. – 2009. – № 1. – Режим доступа: http:www/ aselibrary.ru/digital_resources/journal/irr. – Дата доступа: 17.11.2013.

3. *Маркарова, Т.* Создание электронных образовательных ресурсов в условиях традиционной отраслевой библиотеки / Т. Маркарова, И. Моисеев, Ю. Агафонов // Информационные ресурсы России. – 2008. – № 2. – Режим доступа: http:www/aselibrary.ru/digital_resources/journal/irr. – Дата доступа: 17.11.2013.

4. *Племнек, А. И.* Методология создания комплексной информационно-библиотечной сети вуза / А. И. Племнек, Н. В. Соколова // НТВ СПбГПУ. – СПб., 2007. – № 4. – Т. 2. – С. 169–176.

***Л. І. Доўнар,*** *канд. педагагічных навук, дац., дац. каф. тэорыі і гісторыі ІДК БДУКМ*

# БЕЛАРУСКАМОЎНАЯ КНІГА І СУЧАСНАЕ КНІГАВЫДАННЕ БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Чытанне кніг застаецца важнейшым паказчыкам ўзроўню развіцця культуры і маральна-этычнага стану грамадства. Развіццё сучаснага кнігавыдання Беларусі, беларуская кніга як з'ява ў сусветнай кніжнай культуры патрабуюць пільнага клопату дзяржавы, а таксама адпаведнага навуковага забеспячэння. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў гэтым пытанням надавалася асаблівая ўвага, пра што сведчаць міжнародныя навуковыя форумы і выдадзеныя паводле іх матэрыялы – гэта міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (3–4 красавіка 1996 г.), «Беларуская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ